Источник: **«Звязда» - 2012-06-15**

## Гарэцкія чытанні. Юбілейныя

**У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбылася штогадовая навуковая канферэнцыя, на гэты раз юбілейная, — XX Гарэцкія чытанні на тэму "Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць".**

Відэапрэзентацыя, падрыхтаваная супрацоўнікамі музея гісторыі беларускай літаратуры, пазнаёміла прысутных з Гарэцкімі чытаннямі іншых гадоў.

Літаратуразнаўцы, мовазнаўцы, гісторыкі, пісьменнікі выступілі з цікавымі дакладамі, тэмы якіх сведчаць пра насычанае жыццё, творчую працу двух братоў — волатаў беларускай зямлі. Дырэктар музея Лідзія Макарэвіч адзначыла, што застануцца вечнымі каштоўнасці і асобы: браты Гарэцкія пакінулі значны, непаўторны след у гісторыі беларускай літаратуры, культуры, навукі. Пра цікавыя моманты з біяграфіі Максіма Гарэцкага распавялі пляменнік пісьменніка акадэмік Радзім Гарэцкі, доктар філалагічных навук Таццяна Дасаева, пісьменніца і журналістка газеты "СБ Беларусь сегодня" Людміла Рублеўская і іншыя.

У наступным годзе будзем адзначаць 120-годдзе класіка айчыннай літаратуры, празаіка, публіцыста Максіма Гарэцкага. Адбудзецца шмат святочных мерапрыемстваў. Выступоўцы адзначалі, што 120-годдзе Гарэцкага — гэта нагода, каб сказаць пра тое, што ён павінен знаходзіцца ў адным шэрагу з пачынальнікамі беларускай літаратуры — Максімам Багдановічам, Янкам Купалам, Якубам Коласам, варта спадзявацца на актыўную падтрымку гэтага меркавання.

Арганізатарамі Гарэцкіх чытанняў выступілі Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі.

**Дар'я ШОЦІК**